**Сліж Н.У.**

# ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ АРХІВЕ ФЛАРЭНЦЫІ

Род Медычы меў высокі статус у Еўропе і ўплыў на міжнародную палітыку. Яго актыўнасць была вельмі шырокая: ад палітыкі да культуры[1]. Гэта адлюстравалася ў архіве роду. Гэта быў не толькі асабісты архіў, але і архіў Вялікага Княства Тасканскага (1569–1859). Міжнародныя адносіны мелі важнае значэнне. Прыярытэтнымі былі такія суседнія краіны як Францыя і Іспанія. Аднак Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася таксама пад увагай. Для Медычы Польшча і ВКЛ не былі аднолькавай краінай нават пасля падпісання Люблінскай Уніі ў 1569 г. Цікавасць да нашага рэгіёна была звязана з Асманскай Імперыяй, ад якой увесь час была пагроза Еўропе.

Асноўныя дакументы па знешнепалітычнай дзейнасці Вялікага Княства Тасканскага сканцэнтраваны ў Дзяржаўным Архіве Фларэнцыі (Archivio di Stato di Firenze). Нельга сказаць, што ён добра даследаваны даследчыкамі. У 1960–1992 гг. Польскі Гістарычны Інстытут у Рыме выдаў цэлы шэраг дакументаў з італьянскіх архіваў у рамках серыі *Elementa ad Fontium Editiones.* Тры тамы былі прысвечаны Дзяржаўнаму архіву ў Фларэнцыі [4]. На падставе архіўных матэрыялаў паўсталі артыкулы Дануты Квірыні Паплаўскай [5] і Аўшры Банюліты [3]. Архіў Медычы мае вялікі аб'ём, таму не дзіўна, што дакументы мала ўведзены ў навуковае абарачэнне. Канечне, немагчыма ў дадзеным артыкуле даць поўную характарыстыку крыніц, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным Архіве Фларэнцыі. Мы звярнем увагу на некаторыя звесткі па гісторыі ВКЛ у архіве за перыяд XVI–XVII стст., якія паходзяць з двух фондаў Mediceo del Principato і Miscellanea Medicea.

Большая частка дакументаў утрымлівае звесткі па палітычнай гісторыі. Для Медзічы мела важнае значэнне ведаць пра розныя падзеі за мяжой. Інфармацыя датычылася наступных сфер: кіраўнікі краіны, магнатэрыя і ўплывовыя асобы, унутраныя і знешнія палітычныя падзеі, вайсковыя падзеі. Яна паступала з розных крыніц: амбасадары, шпіёны, кур'еры, вайскоўцы і інш. Звесткі пра ВКЛ прадстаўлены ў наступных відах крыніц: перапіска, навіны, шпіёнскія справаздачы. Варта адзначыць, што часта падаецца дэталёвае апісанне падзей, з веданнем сітуацыі.

Справы, звязаныя з кіраўнікамі краіны, траплялі пад увагу і былі аднымі з важных. У 1573 г. пісалася пра выбары манарха Герыха Валезы. Як вядома яго ківанне было нядоўгім, хутка ён пакінуў краіну. Навіны за снежань 1574 г. інфармавалі, што Жак дэ Фэй падарожнічае па розным месцам Рэчы Паспалітай, заяўляючы, што Генрых Валезы абавязкова вернецца. Згадвалася пра герцага Савойскага як пра аднаго з пераважных кандыдатаў на магчымых новых каралеўскіх выбарах [1, f. 4254, f. 449–450v, 501–502v]. Наступныя выбары справакавалі, шмат інтрыг і канфліктаў. У Венецыю 26 мая 1576 г. кур'ер даставіў навіны з Вены. Паводле іх стала вядома, што было праведзена тры паседжанні па выбару новага караля. На іх выказваліся супраць Стэфана Баторыя і падтрымлівалі імператара Максіміліяна Габсбурга. Амбасадар і маршалак ВКЛ Ян Хадкевіч атрымаў ад імператара каштоўныя падарункі (каралі і срэбраны сервант) за падтрымку [1, f. 3082, f. 477].

Часам траплялiся сярод навін некаторыя прыватныя рэчы пра манархаў. З ліста невядомага да Казімы Медычы вынікае (6 сакавіка 1551 г.), што Жыгімонт Аўгуст атрымаў па замове залатую фларэнтыйскую тканіну, але яна атрымалася не такая, як ён хацеў [1, f. 401, f. 555]. Чылі Алесандра паведамляў Бесарыю Вінце, што Жыгімонт Ваза разам з малым сынам Уладзіславам наведаў пешшу кракаўскія храмы, нядгледзячы на дрэннае надвор'е і дрэнны стан дарог з-за снегу і марозу (14 сакавіка 1608 г.) [1, f. 4294, f. 157; 4, t. XXVII, p. 278–279]. Джавані Батыста апісаў сярод іншых навін Крысціне дэ Лараіне, жонцы Фердынанда Медычы, хрысціны сына Жыгімонта Вазы – Караля. Святкавалі з вячэрай танцамі да глыбокай ночы. На іх было запрошана шмат гасцей (1614) [1, f. 6006, f. 226]. Да Фларэнцыі даходзілі звесткі пра вяселле Уладзіслава Вазы і Цэцыліі Рэнаты (навіны ад 3 верасня 1637 г.) [2, buste 248, № 12].

Падзеі Інфлянскай вайны цікавілі фларэнтыйскі бок. Навіны паведамлялі пра ўваход Інфлянт у склад ВКЛ у 1561 г. [1, f. 4572, f. 132–133], захоп Полацка маскоўскімі войскамі [1, f. 4254, f. 103–105v]. Уяўляюць цікавасць лісты Казімы Бартолі (1503–1572), амбасадара Медычы у Венецыі. Ён быў гуманістам, пісьменнікам, італьянскім філолагам, аўтарам розных твораў. Бартолі інфармаваў Франчэска І Медычы аб плётках, якія віравалі ў Венецыі (30 чэрвеня 1565 г.). Сярод іншага адзначалася пра смерць віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Чорнага (1515–1565), а таксама пра выезд Жыгімонта Аўгуста ў ВКЛ у сувязі з вайной з Маскоўскім княствам [1, f. 516 a, f. 544]. У іншым лісце адзначалася пра прыбыццё маскоўскіх паслоў для сустрэчы з Жыгімонтам Аўгустам з 2 000 коней і

[1] Гістарыяграфія пра род Медычы вельмі багатая. Агульныя тэндэнцыі па яго гісторыі гл.: [6].

800 вазоў з таварамі (16 жніўня 1567 г.) [1, f. 3080, f. 128–130]. У крыніцы не адзначалася месца і дакладныя даты падзеі. У дадзеным выпадку гаворка ішла пра прыём пасольства ў Гародні [7]. У Венецыі таксама апавядалі, што Іван IV трымае 500 польскіх палонных, уключаючы шляхту, у замку ў Інфлянтах. Ён абяцаў іх вызваліць, калі наўзамен яму перададуць ікону Маці Божай з кафедральнага сабора Вільні, якая, як казалі, была напісана святым Лукой. Меркавалася, што прапанова будзе адхілена (5 жніўня 1570 г.) [1, f. 3080, f. 786v–787].

У перыяд Інфлянскай вайны працягваліся замежныя кантакты. У копіі ліста Бернарда Садэрыні (12 кастрычніка 1561 г.) амбасадару Антоніа Альбізі падаецца апісанне велічнага прыёму італьянскага пасольства ў Вільні з урачыстасцямі, балямі і пірамі [1, f. 4293, f. 12v–13].

Шмат увагі надавалася вайне 1654–1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй. Медзічы атрымлівалі інфармацыю пра бітвы, узяцця гарадоў і іншае. У навінах за 27 снежня 1660 г. адзначалася, што маскоўскі гарнізон у Берасці здаўся і перадаў сваю артылерыю і знакі адрознення польскім афіцэрам. А пасяджэнне сейма ў Варшаве было адкладзенае праз падазрэнне на пошасць. Інфармацыя прыходзіла непасрэдна з вайсковага поля дзеяння, перасылалася ў Кракаў, а пасля ў Фларэнцыю. Пры чым дасылалася яна вельмі часта. У дакументах прадстаўлены звесткі пра казацкія, маскоўскія, польскія, літоўскія войскі, пералічваліся мясцовасці, дзе праходзілі бітвы. Лісты напісаны адным почаркам і ўяўляюць сабой нешта падобнае на дзённік вайны за 1664–1667 гг. Толькі апошні пару лістоў напісаны іншай рукой [2, buste 248, № 12, p. 31–117]. Навіны з Рэчы Паспалітай за XVII ст., у тым ліку па вайне прадстаўлены ў іншых справах [2, buste 254, № 13; buste 268, № 4].

Пра шпіёнскую дзейнасць сведчаць цэлы шэраг дакументаў. Напрыклад, у архіве ёсць лісты Жыгімонта Вазы і турэцкага султана Селіма [2, buste 101, № 1]. У Фларэнцыі атрымлівалі інфармацыю пра вынікі сойма 1595 г. [2, buste 101, № 24]. Дакументы за сярэдзіну XVII ст. прадстаўляюць цалкам структуру кіравання Рэчы Паспалітай: пасады ў ВКЛ і Польшчы, асноўныя шляхецкія сем'і, іх уплывовасць і інш. З эліты ВКЛ называліся віленскі ваявода Януш Радзівіл, канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл, падканцлер ВКЛ Казімір Леў Сапега, Павел Сапега, троцкі ваявода Мікалай Стэфан Пац. Адносна Пацаў адзначалася пра іх паходжанне з Фларэнцыі. Адносна кожнага прадстаўніка эліты давалася яго характарыстыка, сувязі з іншымі радамі, сферы дзейнасці і ўплыву, міжнародныя кантакты [2, buste 101, № 16, 27].

Сустракаюцца дакументы фінансавага плана. Ёсць праект падаткаабкладання для пераадолення крызісу за 1590 г. Спецыяльны дакумент прадстаўляў даходы з кожнай адзінкі Польшчы і ВКЛ за 1590 г. Так з Гарадзенскага староства 30 000 злотых, Жамойцкага староства 16 000, Віленскага ваяводства 20 000 і інш. [2, № 28, 36].

Прыведзеная звесткі сведчаць пра наяўнасць у архіве вельмі шырокага спектра інфармацыі, якая можа быць дадатковай, а то і ўнікальнай па розных тэмах. У першую чаргу архіў Медычы важны для даследаванняў па міжнародных адносінах і гісторыі эліт. Агульна ён прадстаўляе істотны момант – гэта зацікаўленасць Вялікага Княства Тасканскага ў тым, што адбывалася ў Вялікім Княстве Літоўскім. Для гэтага выкарыстоўваліся як афіцыйныя, так і неафіцыйныя сродкі. Дакументы даюць магчымасць паглядзець на развіццё гістарычных падзей у ВКЛ з іншага боку, боку Фларэнцыі, што таксама з'яўляецца істотным.

Вывучэнне дакументаў Дзяржаўнага Архіва Фларэнцыі з'яўляецца перспектыўным, і шмат у чым новым накірункам. Крыніцы ўтрымліваюць шмат цікавай і новай інфармацыі па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Яны значна дапаўняюць вядомыя звесткі. Увогуле, у Італіі матэрыялы нашай гісторыі захоўваюцца ў розных архівах і бібліятэках. У далейшым яны патрабуюць сістэмнага вывучэння.


1. Archivio di Stato di Firenze, Mediceo del Principato. – F. 401; 516 a; 3080; 3082; 4254; 4572; 4293; 4294; 6006.
2. Archivio di Stato di Firenze, Miscellanea Medicea – Buste 101, № 1, 16, 24, 27, 28, 36 ; buste 248, № 12; buste 254, № 13 ; buste 268, № 4.
3. Baniulytė, A. Lietuvos didikų Pacų ryšiai su Medičiais XVII a. antrojoje pusėje / A. Baniulytė // Lietuvos istorijos metraštis. – 2002. – № 2. – P. 43–62.
4. Elementa ad Fontium Editiones. T. XXVI–XXVIII. – Res Polonicae ex Archivo Mediceo Florentino. Pars I–III. – Rzym, 1972.
5. Popławska, D. Q. Korespondencja dotycząca Polski w zbiorach florenckiego Archivio di Stato i jej kolekcje / D. Q. Popławska // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – 1988. – T. 33. – S. 125–136.
6. Ricciardelli, F. The Medici: the power of a dynasty / F. Ricciardelli. – Firenze : Mauro Pagliai, 2021. – 144 p.
7. Сліж, Н. Гравюра Гародні Адэльгаўзера– Цюндта 1567– 1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця / Н. Сліж // Arche. Гарадская гісторыя Беларусі. – 2017. – № 2. – С. 9–105.